# МАЛАДОСЦЬ І КАХАННЕ Ў АПАВЯДАННЯХ ІВАНА ШАМЯКІНА

***Т. В. БЕЛЬСКАЯ***[a]

[a]*Кафедра беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

Артыкул вызначаецца характарыстыкай літаратурнага развіцця другой паловы XX стагоддзя і выяўляе відавочнае нарастанне пафасу духоўнасці на аснове дакладнага аналізу звычайнай рэчаіснасці ў апавяданнях І. Шамякіна. Прааналізаваны празаічныя творы пісьменніка, прысвечаныя тэме кахання.

***Ключавыя словы***: жанр апавядання, праблематыка твораў, маральна-грамадзянскі пафас, тэма кахання, вобраз маці, стыль, дакументальная проза

# YOUTH AND LOVE IN IVAN SHAMYAKIN'S STORIES

***T. BEL'SKAYA***[a]

[a]*Department of the Belarusian literature and culture of the Philological Faculty of Belarusian State University*

The article defines the characteristics of the literary development of the second half of the XX century, and shows a clear increase in the pathos of spirituality based on accurate analysis of ordinary reality in the I. Shamyakin's stories. In the article the prose works about love are analyzed.

***Key word:*** narrative genre, works issues, moral and civic pathos, love theme, mother image, style, documentary prose

**Узор цытавання**: Бельская Т.В. Маладосць і каханне ў апавяданнях Івана Шамякіна // Сафія. 2016. № 1. С. 4–16.

**For citation:** Belskaya T. Youth and love in Ivan Shamyakin's stories // Sofia. 2016. № 1. P. 4–16 (in Belar.).

**Аўтар**:
***Бельская Тацццяна Віктараўна*** — старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта БДУ

**Author**:
***Belskaya Tatiana*** — Senior lecturer of the Belarusian literature and culture Department of the Philological Faculty of BSU
phyl@bsu.by



***Таццяна Бельская***
***(Мінск, БДУ)***

# МАЛАДОСЦЬ І КАХАННЕ Ў АПАВЯДАННЯХ ІВАНА ШАМЯКІНА

У 50-я гады — на пачатку 60-х гадоў XX ст. Іван Шамякін піша шэраг апавяданняў, у якіх ён поўнасцю засяроджваецца на маральнай праблематыцы: “Спі, мой сыночак…” (1951), “Вясновымі днямі” (1953), “Першае спатканне” (1953), “Бацькі і дзеці” (1954), “Дзеці настаўніцы” (1960), “Вячэрні сеанс” (1960), “Модніца” (1960), “Непрыгожая” (1960) і інш.

У абвостраным маральным пафасе была адзнака самога часу. Як адзначаў В. Талстых: “У савецкім літаратуразнаўстве 60-х гадоў абсалютна справядліва ўсталяваўся погляд, што ніколі яшчэ савецкая проза, паэзія і драматургія за ўсю шасцідзесяцігадовую гісторыю свайго развіцця не падыходзіла так блізка, ушчыльную да душы сучасніка…” [1, с. 32].

У творах І. Шамякіна адчуваецца выразны паварот да маральных праблем жыцця ў іх цеснай знітаванасці з праблемамі сацыяльнымі, прычым маральнае часта набывае сацыяльны маштаб, а сацыяльнае абумоўлівае маральнае ўдасканаленне чалавека.

Вялікая ўвага надаецца першаму пачуццю закаханасці. Маладосць — час усталявання самых высокіх і чыстых пачуццяў. Але ў маладосці не стае жыццёвага вопыту. Нездарма гаворыцца, што лепшыя настаўнікі ў жыцці — гэта вопыт і пачуцці. І калі вопыту героям апавяданняў І. Шамякіна яшчэ трэба набірацца, то пачуцці ўжо могуць падказаць, як сябе паводзіць у жыцці.

Герой апавядання “Вясновымі днямі” (1953) Яўмен працуе на трактары і разам са сваім напарнікам накіраваны ў дапамогу суседняму калгасу. Там, у калгасе, ён сустракае дзяўчыну Надзю, у якую шчыра і па-сапраўднаму зака-

хаўся. Першае глыбокае пачуццё выклікае такі эмацыянальны ўсплёск у душы героя, што непасрэдным чынам уплывае на эфектыўнасць працы.

"Адзін тыдзень. Але які гэта быў тыдзень у жыцці Яўмена! Да яго прыйшло першае і сапраўднае каханне. Яны пазнаёміліся з Надзяй у першы дзень у кіно і пасля штовечар сустракаліся: хадзілі па вёсцы або да раніцы праседжвалі пад старымі ліпамі каля калгаснага саду. Цяпер ён успамінаў гэтыя сустрэчы, і ў яго так светла, так хораша рабілася на сэрцы, што хацелася працаваць і працаваць, без адпачынку, без меры".

Чаму аўтар выяўляе інтымныя пачуцці свайго героя праз працоўны энтузіязм? Можа быць, па той прычыне, што сапраўднае пачуццё хутчэй выражаецца справай, чым словамі?

Маральна-грамадзянскае і эмацыянальна-ўзроставае сталенне маладога чалавека падаецца аўтарам як выпрабаванне на чалавечнасць і высакародства, а ў выніку атрымліваецца цэласнае чалавеказнаўчае даследаванне, дзе галоўную ролю адыгрываюць характар, сэрца і добрыя пачуцці галоўнага героя. Нягледзячы на маладосць, Яўмен праяўляе ў сваіх паводзінах сапраўдную духоўную сталасць: калі ён зразумеў, што пачуцці яго каханай да Валянціна сапраўдныя, шчырыя, саступае суперніку.

У апавяданні "Першае спатканне" (1953) паказана нараджэнне першага пачуцця. Уся ўвага пісьменніка засяроджана на перажываннях галоўнага героя, на эмацыянальна-псіхалагічным стане закаханага Сашы.

Здавалася б, што такога асаблівага ў першым пачуцці закаханасці, першым юнацкім захапленні? І. Шамякін і сам падкрэслівае звычайнасць перажыванняў галоўнага героя: "Было першае спатканне ў жыцці. А каго яно не хвалявала? Хто не помніць свайго першага спаткання?"

Аказваецца, паказ жыцця ў інтымных перажываннях і пачуццях можа даць вельмі многае і абсалютна дастатковы, каб даць магчымасць чытачу ўявіць цэльнае і закончанае ўнутранае аблічча герояў. Саму паўсядзённасць, звычайнасць, духоўную сутнасць жыцця чалавека І. Шамякін умее паказаць так, што ўзнікае ўражанне надзвычайнай маральнай значнасці ўчынкаў герояў: "Даўшы згоду акампаніраваць, Саша ўпотайкі пасля марыў, што дзяўчына гэта будзе спяваць незвычайна, што ўсе будуць у захапленні ад яе голасу і ён, Саша, зможа пасля ганарыцца, што дапамог выявіцца такому выключнаму таленту. Мары

яго ішлі нават у далёкае будучае, калі дзяўчына стане вядомай спявачкай і ён, урач, — ён не хацеў быць музыкантам-прафесіяналам — сустрэне яе недзе ў сталіцы…”

Рамантычныя мары героя, яго душэўная ўзнёсласць, натуральнасць, непасрэднасць, яснасць і жывасць апавядання, рэалістычная дакладнасць апісанняў надаюць асаблівую мастацкую адметнасць гэтаму твору, выводзяць у шэраг лепшых айчынных твораў на тэму кахання.

Асабліва прыцягвае ўвагу ў гэтым творы па-стэндалеўску тонкае разуменне вытокаў пачуцця закаханасці, прадчуванне яго. Стэндаль гаварыў, што ў каханні галоўнае шчасце заключаецца не ў самім каханні, а ў апошнім кроку да яго. Герой апавядання Саша Караневіч якраз і паказаны ў такі час і ў такім стане, калі прадчуванне кахання, бадай, радасней за ўсе астатнія пачуцці, што поўняць яго маладое сэрца: “У Сашы ажно заняло дыханне, калі ён узышоў на чыгунку. Радасна было ад адчування гэтага бязмежнага прастору. Юнаку здавалася, што ён не ідзе, а ляціць. Вецер свістаў каля вушэй, надзімаючы сацінавую сарочку, як ветразь, кудлачачы валасы на галаве…”

У апавяданнях пісьменнік робіць выразны акцэнт і на маральнай адказнасці свайго героя за тыя ўчынкі, якія адбыліся ў мінулым. Галоўны герой апавядання “Непрыгожая” (1960), сустрэўшы праз сорак год дзяўчыну, якой прызначаў некалі спатканне і нават цалаваўся, адчувае адказнасць за свае былыя пачуцці, разумеючы, што ў нечым мог падмануць у мінулым надзеі сваёй сяброўкі. “На развітанне яна моцна пацiснула мне руку, далонь яе была шурпатая, мазолістая — жанчына не цуралася любой працы. І мне раптам захацелася пацалаваць гэту руку. Не, мне захацелася больш — абняць і пацалаваць яе самую. Але, безумоўна, пацалаваць не так, як некалі ў юнацтве, і ўвогуле не як жанчыну, а як добрага чалавека, за тое, што, не маючы асабістага шчасця, яна не страціла веры ў людзей, у прыгажосць жыцця і сама стварае гэту прыгажосць.”

Гэты пацалунак — і знак удзячнасці, і даніна мужнасці гэтай жанчыне, якая адна выхоўвае двух чужых дзяцей, і ўсведамленне сваёй віны.

Як пазней прызнаваўся сам пісьменнік, у аснову гэтага твора пакладзены і яго асабісты маральны вопыт: “…сваё першае свядомае рамантычнае спатканне я падрабязна апісаў у апавяданні “Непрыгожая”, хоць, безумоўна, з пэўнай

доляй вымыслу. Правобразам гераіні — настаўніцы Надзежды Іванаўны, безумоўна, была Каця (аднакласніца Івана Шамякіна па макаўскай школе — Т.Б.)” [2, с. 60].

У апавяданні “Непрыгожая”, адным з лепшых апавяданняў І. Шамякіна на маральную тэму, адчуваецца нарастанне ў агульначалавечым плане шырокай, а не лакалізаванай пэўным жыццёвым матэрыялам маральна-этычнай праблематыкі. Пісьменніка ў многім тут прываблівае маральнае як асаблівы прадмет спецыяльнага даследавання — у яго чыстым, “субстантыўным” абліччы. Менавіта чыстае сумленне, і ўдзячная памяць пра мінулае фарміруюць асобу, пачуццё адказнасці за свае ўчынкі, паводзіны, думкі і нават намеры. Такім мы бачым героя Івана Шамякіна.

Маральна-этычны ракурс бачання рэчаіснасці ў пісьменніка арганічна пераходзіць у асаблівую тэму, і яна, гэтая тэма, садзейнічае выпрацоўцы адпаведнага стылю, манеры пісьма. Пісьменнік вельмі па-асабліваму перадае тое, што ўспрыняла яго душа ў мінулым, чым поўніцца яна ў момант напісання твора. Ён адчувае сябе па-сапраўднаму блізкім да таго, што адлюстроўвае.

Паказальным у гэтым плане з’яўляецца апавяданне “Спі, мой сыночак…” (1951). Напісана яно было пасля нараджэння сына Аляксандра і ў многім перадавала перажыванні і шчаслівае адчуванне маладога бацькі. Але ў гэтым творы І. Шамякін узвышаецца і да стварэння складанага ў псіхалагічных адносінах партрэта жанчыны-маці. Гэтае апавяданне аб бясконцых і трапяткіх клопатах маці пра толькі што нарадзіўшагася сына гучыць як сапраўдны гімн мацярынскай любові: “У калідоры, непадалёку ад нашай палаты, чуецца дзіцячы крык. Пачало нейкае адно — мне здаецца, што гэта — мой, такі ранні і звонкі, — а за ім, нібы разбуджаныя, заліваюцца ўсе, ды так дружна, галасіста, што, мабыць, крыкі іх чуваць далёка за вокнамі гэтага светлага будынка, на гарадской вуліцы. Яны нібы вітаюць раніцу і абвяшчаюць аб сваім з’яўленні, аб сваім праве на месца пад сонцам”.

Пра вобраз маці, увогуле жанчыны ў творчасці І. Шамякіна неаднаразова пісалі даследчыкі, акцэнтуючы ўвагу на тым, што многія прывабныя рысы яго маці, Сынклеціі Іванаўны, і жонкі, Марыі Філатаўны, сталі асновай стварэння вобразаў літаратурных. “Думаецца, што Івану Шамякіну надзвычай імпанавала Коласава непахісная сардэчная адданасць жонцы Марыі Дзмітрыеўне. Сямей-

нае жыццё з Марыяй Філатаўнай Кротавай Іван Пятровіч усталёўваў на тым самым прынцыпе. Ва ўсякім разе, гарманічнасць гэтага жыцця, заснаваная на глыбокай духоўнай еднасці мужа і жонкі, у абодвух пісьменнікаў бясспрэчная," — адзначае Д.Я. Бугаёў.

Гісторыю кахання да сваёй будучай жонкі пісьменнік найбольш паэтычна і пераканаўча паказаў у аўтабіяграфічнай аповесці "Непаўторная вясна" (1957), якая дала пачатак шырокаму мастацкаму палатну — пенталогіі "Трывожнае шчасце" (1965).

У іншых творах, у адных у большай ступені, у другіх у меншай, вобраз Марыі Філатаўны, жонкі Івана Шамякіна, спадарожніцы праз доўгія гады, паплечніцы і шчырай памочніцы, каханай на ўсё жыццё, таксама прысутнічае. Гэта і Таццяна Маеўская з "Глыбокай плыні" (1949), і Тася Батрак з рамана "Вазьму твой боль" (1979), і Поля Шугачова з "Атлантаў і карыятыд" (1974), і Вольга Ляновіч з аповесці "Гандлярка і паэт" (1976) і многіх іншых. Асобныя рысы жончынай натуры, яе характара прасочваюцца і ў некаторых вобразах яго апавяданняў. Як падкрэсліваў сам пісьменнік, багаты матэрыял для стварэння жаночых вобразаў давалі ўсе "праявы жыцця, якое я ўважліва назіраў, і ў першую чаргу тое, што жонкай маёй была жанчына, якая багата выяўляла ўсе чалавечыя эмоцыі — каханне да мужа, любоў да дзяцей, вернасць, адданасць, рэўнасць… усё-ўсё" [2, с. 180].

Асабіста перажытае падмацоўвала праўдзівасць апавяданняў І. Шамякіна, спавядальная інтанацыя — непасрэднасць і сапраўднасць пачуццяў. Творы пісьменніка на маральную тэму асабліва прываблiваюць тым, што аўтарскае, асабіста перажытае перадаецца не толькі праз падзеі, непасрэдным удзельнікам якіх быў сам аўтар, але і праз надзвычайную інтэнсіўнасць унутранага духоўнага жыцця, маральныя пошукі лірычнага героя твораў. Сама рэчаіснасць падказвала пісьменніку шматаблічны "чалавечы" матэрыял, які настойліва імкнуўся перарасці ў творчую тэматыку, стаць пэўным мастацкім адкрыццём. Мастацкая тэма нараджалася дзякуючы ўласнаму жыццёва-творчаму вопыту пісьменніка, выношвалася яго ўласным роздумам і перажываннямі, станавілася грамадскім вопытам усёй літаратуры, сведчыла аб гістарычных магчымасцях усяго грамадства. Значнасць твораў І. Шамякіна і сёння ў многім вызначаецца

тым, што ён умеў у паўсядзённым, звычайным адкрываць пошук той праўды, вышэйшага сэнсу і мэты жыцця чалавека, якія нараджаліся ў самых глыбінных нетрах народнага існавання.

Апавяданні “Хлеб” (1969) і “Матрос з “Алега” (1970) паклалі пачатак новай тэме ў творчасці пісьменніка — тэме рэвалюцыйнага абнаўлення грамадства на пачатку XX стагоддзя, якая пазней будзе з поспехам працягвацца ў аповесцях і рамане “Петраград — Брэст”. Сам пісьменнік прыгадваў, што тэму і ідэю апавядання “Хлеб” падказала знойдзеная ім у пяцідзесятым томе Збору твораў У.І. Леніна тэлеграма. Як адзначаў сам Іван Шамякін, “не магла не ўсхваляваць такая тэлеграма... Простая маскоўская работніца ў вельмі цяжкі час — гэта напісана 12 снежня 1918 года, калі харчовае становішча Масквы, Петраграда, іншых прамысловых цэнтраў было надзвычай цяжкае і ў сувязі з гэтым была ўведзена хлебная манаполія, уведзены прадатрады — з тым, каб прысекчы на кораню спекуляцыю хлебам і прадуктамі, раптам звяртаецца да Уладзіміра Ільіча, і ён разумее яе становішча... І я сеў — самае простае сесці за рабочы стол — і напісаў апавяданне “Хлеб”.

Іван Шамякін сваімі апавяданнямі “Хлеб” і “Матрос з “Алега” паказаў, што характар чалавека новай рэвалюцыйнай эпохі можа быць раскрыты не толькі праз непасрэдны паказ рэвалюцыйнай барацьбы, але і праз усе абставіны чалавечага жыцця.

У апавяданні “Хлеб” вызначальным з’яўляецца тое, з якім майстэрствам праблемы сям’і, жыццё і быт звычайных людзей уключаюцца ў шматскладаны бурлівы час самой рэвалюцыйнай эпохі. Сацыяльнае, класавае ў творы раскрываецца праз асабістае, часам наіўна-дзіцячае (малая дачка галоўнай гераіні расказвае брату пра тое, як сніцца ёй хлеб, як яго везлі на вялікіх санях — цэлую гару боханаў!) ці сялянска-насцярожлівае (брат Аксінні ўвесь час сумняваецца ў тым, што яго сястру пусцяць да кіраўніка дзяржавы). Героі твора па сваіх інтарэсах, сімпатыях вельмі далёкія ад ідэі рэвалюцыйнага пераўтварэння свету, але сэнс іх чалавечага існавання выяўляецца аўтарам праз супастаўленне з ідэямі, мэтамі і самім зместам вялікіх гістарычных пераўтварэнняў. Адказ на галоўнае пытанне гераіні, якое яна адрасуе самому Леніну (ці можна прывезці хлеб для хворых дзяцей?), пачынае галоўны псіхалагічны рух у калізіі ўсяго твора — апавяданне пра Леніна, рэвалюцыю, суровую атмасферу першых пас-

лярэвалюцыйных гадоў. Аўтар апавядання атрымаў магчымасць аб’ектыўнага выяўлення розных чалавечых лёсаў, перадачы самога руху гісторыі, паказу заканамернасці і непазбежнасці рашучых перамен у лёсе народным.

Галоўны герой апавядання “Матрос з “Алега” у сваім расказе пра Леніна таксама паўстае перад намі як сапраўдны сын свайго стагоддзя. Рэвалюцыя ўзняла матроса Сураўца, прымусіла задумацца пра самыя незвычайныя рэчы. Ленін для яго дарагі і вялікі чалавек, да яго вобраза звернуты думкі і мары галоўнага героя. “І была ў мяне мара, — прызнаецца Суравец, — трапіць якнебудзь вартавым на пост, які мы ў думках, у размовах паміж сабой называлі галоўным — каля кабінета Старшыні Саўнаркома Леніна”. Хацелася матросу ўбачыць правадыра зблізку, сустрэцца, як кажуць, тварам у твар, можа нават пагутарыць. За гэтымі высокімі парываннямі выразна прасочваецца жыццёвая біяграфія галоўнага героя, яго асабісты шлях у рэвалюцыю, наіўная ўпэўненасць, што толькі ён з таварышамі можа абараніць Леніна ад найвялікшай небяспекі — замаху на яго жыццё.

Своеасаблівы каларыт сцэны, калі ўсё ж такі мара матроса Сураўца спраўджваецца і ён сустракаецца з Леніным, прыадкрывае нам яшчэ адну са старонак, на якіх біяграфія стагоддзя, гісторыя ў яе велічным і значным змесце сустракаецца са звычайным, радавым і штодзённым.

Жыццёвы вопыт, маральная дасканаласць героя выяўляюць сваю сапраўдную сутнасць у драматычным канфлікце паміж старым і новым. У падзеях, непасрэдным дзеянні галоўнага героя твора (ахова Смольнага, тэлефоннай станцыі, тэлеграфа, ажыццяўленне адказнага даручэння каманды крэйсера дэлегаваць матроса Сураўца для аховы Леніна ад замаху на яго жыццё і інш.) праяўляецца гістарычная значнасць характару. Аўтар імкнецца прасачыць лёс свайго героя на працягу амаль цэлага паўстагоддзя, паказвае яго ў мірнай працы (некалі грозны матрос баявога крэйсера становіцца сельскім фельчарам), падкрэслівае несупадзенне, адрознасць вобразаў мінулага і дня сённяшняга: “Самае дзіўнае, што мне ніяк не ўдавалася, як ні напружваў я фантазію, уявіць таго маладога, рашучага бравага матроса, які камандаваў атрадам. Той уяўляўся высокім, шыракаплечым — асілкам! А сядзеў перада мной, цераз стол, нізенькі хударлявы стары з пракуранымі і абкусанымі рудаватымі вусікамі...”

Іван Шамякін будзе працягваць гэтую тэму ў аповесці “Першы генерал”, якая напісана ім у тым жа 1970 годзе. У ёй пісьменнік стварыў больш пераканаўчы сацыяльны і псіхалагічны малюнак няпростага станаўлення маладога чалавека, таксама сялянскага хлопца, які становіцца барацьбітом у грозную эпоху вялікіх бітваў.

Пасля апавядання “Матрос з “Алега” І. Шамякін не звяртаўся да “малафарматнага” жанру амаль трыццаць гадоў. З 1970 года па 1999 год І. Шамякін інтэнсіўна працаваў над раманамі, пісаў аповесці, драматургічныя творы, шмат увагі ўдзяляў публіцыстыцы, літаратурнай эсэістыцы і крытыцы і не звяртаўся да жанру апавядання Сам пісьменнік пра аб’ём напісанага ў гэты час успамінае наступнае: “Калі выйшаў у наш час (80-я гады — *Т. Б.*) шасцітомны бібліяграфічны даведнік “Беларускія пісьменнікі”, я сам здзівіўся, колькі там маіх публіцыстычных артыкулаў, прытым не толькі ў нашых газетах, але ў маскоўскіх, украінскіх, малдаўскіх, армянскіх... Зараз шкадую, што столькі траціў энергіі, часу на пустую справу. Але ці варта шкадаваць працу маладосці?”

Напрыканцы XX — пачатку XXI стагоддзяў Іван Шамякін вяртаецца да жанру апавядання, і ў гэтых творах, якія былі напісаны пасля значнага перапынку, усё больш дакументальнасці, успамінаў, шчырай спавядальнасці. Пісаў іх празаік, які збярог цудоўную вобразную і прадметную памяць і які паранейшаму з вялікім майстэрствам умеў паказаць сваіх герояў на выразным бытавым і гістарычным матэрыяле. Пісьменнікам у гэты час кіруе неадольнае жаданне, можна сказаць, гарачая прага расказаць пра сябе, сваё пакаленне, равеснікаў і сяброў, блізкіх і родных, увогуле пра тое, што ў думках і пачуццях аўтара назапашвалася і збіралася не адно дзесяцігоддзе. Такі матэрыял патрабаваў адмаўлення ад ужо звыклых мастакоўскіх метадаў і прыёмаў пісьма, іншага асэнсавання матэрыялу. Як адзначаў сам І. Шамякін, “дзённік — не мастацкі твор, яго не шліфуеш”.

Пісьменнік на пачатку XXI стагоддзя нездарма звяртаецца менавіта да такой “дакументальнай” прозы. Ён цудоўна разумее, што вялікая сіла эпічнага абагульнення праяўляецца і праз асабістае бачанне свету, вопыт пражытага, калі аўтар з выразнай сілай лірызму выказвае самае запаветнае, тое, што яму найбольш блізкае і дарагое. Законы чалавечага жыцця бяруць сваё: на думку пісьменніка, неабходна аддаць сучаснікам і нашчадкам усё тое багацце са скар-

бонкі памяці і чым ты пакуль валодаў толькі адзін, што відавочна патрабуе і просіцца стаць духоўным набыткам многіх…

Прозу са зборніка апавяданняў "Промні маленства" (2002) можна назваць дакументальнай. Прычым гэта тая дакументальнасць, якая не заўсёды лёгка вызначаецца, паддаецца вытлумачэнню, яе, хутчэй, адчуваеш, як, скажам, адчуваецца чысціня паветра, якім дыхаеш. Перад намі творы, у якіх у пэўнай ступені заканчваецца мастацтва, а дыхае сама эпоха. У апавяданнях са зборніка "Промні маленства" два героі — час і асоба пісьменніка.

Дзіцячыя гады, — лічыць Іван Шамякін, — вельмі многае, калі не ўсё, вытлумачваюць у жыцці чалавека: кожны крок у дзяцінстве можа пазней праявіцца па-рознаму — мужнасцю і подзвігам ці баязлівасцю і здрадай. Усё наступнае жыццё па сутнасці дафарміроўвае тое, што закладваецца ў чалавеку раней, яшчэ ў дзяцінстве. У сапраўдным мастацтве зварот да дзяцінства заўсёды станавіўся апавяданнем пра тое, як, у якіх умовах фарміраваўся чалавек як асоба. У аўтабіяграфічных аповесцях Л. Талстога, М. Горкага, інш. пісьменнікаў паказаны складаны свет пачуццяў, настрояў, роздумаў, праз якія фарміруецца чалавечы характар, уплыў самога асяроддзя на чалавечую індывідуальнасць.

Іван Шамякін у апавяданнях зборніка "Промні маленства" таксама звяртаецца да самых вытокаў фарміравання чалавечай асобы. У гэтых творах незвычайна выразна праяўляецца індывідуальнасць аўтара, раскрываецца ў "інтымным" плане асоба мастака, паказана станаўленне яго таленту.

Іван Шамякін даносіць да нас складанае ў эмацыянальным плане жыццё вясковага хлапчука літаральна з першых крокаў на зямлі, з усведамлення сябе як асобы (апавяданні "Вышыня", "Дзядзька і ніткі", "Цуд на краі свету", "Пастух", "Азбука", "Навука" і інш.), пасля распавядае пра пераломныя падлеткавыя гады, якія супадаюць з пераломамі ва ўсім жыцці грамадства, істотным яго абнаўленнем (апавяданні "Скачок", "Каханне", "Кнігі", "Трэцяя школа", "Вока Сталіна" і інш.).

Такія розныя па сваім лёсе і характары людзі, што акружаюць хлапчука (маці, бацька, леснікі, дзядзька Трафім), першыя радасці (пераезд на новае месца жыхарства, сустрэча з першай кнігай, знаёмства з кінематографам, нарэшце, першае сапраўднае пачуццё закаханасці), першыя жыццёвыя выпра-

баванні і катастрафічныя страты (хатнія беды, бацькавы пакаранні, сустрэча з воўкам, бойка за хлеб, першы страх смерці, выратаванне на рацэ) служаць спасціжэнню самога часу, яго ўздзеянню на лёс чалавека і яго характар. У кожнай выкладзенай аўтарам гісторыі нямала драматычнага, суровага і адначасова паэтычнага, добрага, мудрага, часам абсалютна шчаслівага.

У апавяданні "Воўк" расказваецца пра трагічную сустрэчу ў лесе з воўкам. Малы хлопчык, які ходзіць за некалькі кіламетраў ад дома ў школу, не ўсведамляе ўсёй небяспекі сітуацыі, у якую трапляе. Трагізм, небяспеку здарэння разумеюць сяляне — леснікі, якія напужалі і прагналі ваўка, а малога падвезлі дахаты, папярэдзіўшы бацьку, каб больш не адпускаў сына аднаго. Для малога ж хлапчука здарэнне — чарговая прыгода, а таксама спосаб пазнання свету, які расчыняе перад малым свае дзівосныя і неверагодныя рэчы. Сплаў рэальна-даставернага, канкрэтна-рэалістычнага і паэтычнага, пераломленага праз прызму асаблівага непаўторнага дзіцячага бачання, афарбаванага ў рамантычныя паўтоны, і стварае той свет, у які нас запрашае аўтар.

У апавяданні "Цуд на краі свету" трагічнае адчуванне няўстойлівасці і пераменлівасці свету падсвечваецца паэтычным успрыняццем гэтага свету хлапчуком, перад якім адкрываюцца ўсе яго таямніцы, неабсяжнасць і хараство: "Але найбольш зачаравала чыгунка — бліскучыя рэйкі, што беглі ў два бакі, дзіўна звужаючыся, у мройнай далечыні, як бы зліваючыся ў адну. Мне далі пагуляць на рэйках і нават паляжаць — паслухаць, прыклаўшы вуха да гарачага жалеза, як яны гудуць. Ах, як хацелася пабачыць поезд, пра які расказвалі столькі цудаў". Вялікі свет адкрываецца перад вачамі героя: "Там, за шырокай ракой, — вербы, а за імі — стрэхі хат. Дык, выходзіць, і там свет, і там людзі! Чаго ж ты баялася, бабуля? Во я стаю на краі свету — і мне не страшна!" У паэтычнай інтанацыі гэтага апавядання гучыць чысты і непасрэдны голас дзяцінства.

Маленькі герой апавяданняў са зборніка "Промні маленства" падзяляе ўсіх людзей на добрых і злых. Дакладней, у яго свядомасці, успрыняцці свету ўсе людзі, якія яго акружаюць, групуюцца па тых ці іншых маральных уласцівасцях. Аўтар прыгадвае цыганку, якая выратавала яму жыццё (апавяданне "Плыты"), леснікоў, якія не пакінулі малога на згубу ваўкам (апавяданне "Воўк"), хлопцаў-равеснікаў, якія ледзь не адабралі з цяжкасцю набыты хлеб

галоднай вясною 1933 года (апавяданне “Бойка за хлеб”), дзядзьку Трафіма, да якога хінуўся душою і які навучыў абараняцца ад негатыўных праяў жыцця дасціпным жартам (апавяданне “Дзядзька і ніткі”) і многіх іншых людзей, якія сустрэліся яму на жыццёвай дарозе. У сваіх цесных узаемасувязях з іншымі людзьмі і ўсім светам герой набывае той вопыт, які многае вызначыць у яго ўласным лёсе. І не адзін раз пісьменнік у сваіх расповедах перакіне кладачку з таго далёкага часу, які стаў успамінам, да сябе сённяшняга, у сучаснасць: “Які ж я быў шчаслівы ў той час! Дагэтуль помню тое пачуццё незвычайнага шчасця. Пражыў 75 гадоў, паездзіў па свеце, убачыў многія шырокія рэкі: Дняпро, Волгу, Дунай, Віслу, Гудзон, але былі яны нішто ў параўнанні з ракой майго маленства Сожам. Плаваў на вялізных акіянскіх караблях, але ніводзін з іх не здаўся прыгажэйшым, чым той параход, які я ўбачыў упершыню ў няпоўныя пяць сваіх гадоў”.

Сваіх герояў І. Шамякін паказвае па-рознаму, але заўсёды з пачуццём вялікай замілаванасці: у адных выпадках — з большай сілай лірызму, як бы спавядаючыся, расказваючы пра шчасце і гора, якое давялося перажыць самому, у другіх — з большай аналітычнасцю, быццам нанова і больш пільна ўглядаючыся ў чалавека, каб выпісаць яго “псіхалагічны” партрэт дакладнымі мастацкімі фарбамі.

Пры ўсёй спраецыраванасці на асабістае, уласнае, уласцівае дадзенай жыццёвай біяграфіі, гэта і гісторыя ўсяго пакалення, да якога адносіць сябе пісьменнік Іван Шамякін. Асаблівасцю ж гэтага пакалення з’яўляецца незвычайнае абвостранае ўсведамленне далучанасці свайго асабістага лёсу да лёсаў многіх, да жыцця ўсяго грамадства. Уласнае жыццё пісьменніка, яго біяграфія асэнсоўваюцца і як адна са з’яў часу гістарычнага. Такі “біяграфізм” перадаецца і праз спавядальную манеру пісьма і праз аб’ектывізаваную сапраўднасць таго, што адбываецца на старонках апавяданняў.

Што выносіш асабіста для сябе з такой прозы? Перш за ўсё, Духоўную і нават інтымна-сардэчную атмасферу, у якой нарадзіўся і рос пісьменнік, адзін з самых вядомых беларускіх празаікаў XX стагоддзя. Такая проза ў пэўным сэнсе дамалёўвае партрэт самога пісьменніка, прымушае задумацца над вытокамі жыццёвага лёсу і ўсёй творчасці празаіка.

Зборнік апавяданняў “Промні маленства” можна назваць заканамерным у творчасці Івана Шамякіна: пісьменнік не страціў цікавасці да свету, наадварот, яго цікавяць самыя раннія вытокі фарміравання чалавека як такога, прычым асабісты вопыт у гэтым выпадку асэнсоўваецца як вопыт людзей цэлага пакалення. У асобе празаіка па-ранейшаму відавочныя арыгінальны талент, выпрацаваны ў мэтанакіраваным імкненні ўдасканалення асабістага светаадчування, актыўная грамадзянская пазіцыя амаль заўсёдны, нястомны творчы пошук, які вядзецца пад знакам абнаўлення і тэматыкі, і паэтыкі, і саміх вобразаў твора, і, нарэшце, працавітасць і творчая прадуктыўнасць.

Арыгінальнасць, адметнасць апавяданняў са зборніка “Промні маленства” не толькі ў дакладным веданні дзіцячай псіхалогіі, у майстэрстве раскрыць хвалюючы і радасны ўнутраны свет маленькага чалавека. І. Шамякін змог узнавіць незабываемыя часы ў яркіх запамінальных рысах і вобразах, паказаць уплыў самога часу на фарміраванне дзіцячага і падлеткавага характару.

Апавяданні Івана Шамякіна грунтуюцца на абсалютнай праўдзе жыцця, яго творы найлепшым чынам выяўляюць і вяртаюць чалавеку усведамленне яго паўнаты і адзінства. Адным гэтым ён унёс неацэнны ўклад у скарбніцу сацыяльнага і маральнага вопыту цэлага пакалення чытачоў. Сёння мы не можам уявіць свой маральны і эстэтычны вопыт без герояў прозы Івана Шамякіна, якія ўвайшлі ў нашу свядомасць, у наша жыццё як вельмі блізкія і дарагія нам людзі.

ЛІТАРАТУРА

1. Толстых, В. Не моралью единой. В кн.: Искусство нравственное и безнравственное. — М., 1986.

2. Шамякін, І. Збор твораў. — Т. 1. — Мінск: Маст. літ., 2003.